*І.Л. БУРАК*

# СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫЯ СКАЗЫ. АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

Складаныя сказы, у якіх пры дапамозе злучальных злучнікаў або злучальных слоў аб'ядноўваюцца сінтаксічна раўнапраўныя прэдыкатыўныя часткі, называюцца складаназлучанымі.

Па структуры складаназлучаныя сказы могуць складацца з дзвюх і больш прэдыкатыўных частак, паміж якімі выражаны спалучальныя, супастаўляльныя, пералічальна-размеркавальныя і розныя віды далучальных адносін. Гэтыя адносіны сведчаць аб наяўнасці пэўнай адпаведнасці або адрознення паміж аб'яднанымі часткамі незалежна ад іх канкрэтнага лексіка-граматычнага напаўнення.

Прэдыкатыўныя часткі складаназлучаных сказаў заўсёды цесна ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. Гэта ўзаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць вызначаецца характарам выражаных адносін паміж прэдыкатыўнымі часткамі і будовай гэтых частак. Так, спалучальная ўзаемасувязь рэалізуецца ў трывальна-часавых суадносінах выказнікаў прэдыкатыўных частак, супастаўляльная – у лексіка-граматычным значэнні супастаўляльных членаў, пералічальна-размеркавальная – у характары злучальных сродкаў, далучальная – у інтанацыйным афармленні і разнароднасці саставу аб'яднаных частак: *Праходзіць ноч і меркнуць зоры* (Я. Колас). *Сонейка прыпарвала зямлю, а лёгкі ветрык ласкава асвяжаў твар* (А. Пальчэўскі). *То сонца выблісне, то дожджык заімжыць* (М. Багдановіч). *Ты то рад, ды яны не рады* (К. Крапіва).

У складаназлучаных сказах толькі першая прэдыкатыўная частка пабудавана больш-менш свабодна; будова ж другой прэдыкатыўнай часткі звычайна абумоўлена будовай першай часткі. Гэта абумоўленасць

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

выяўляецца ў парадку слоў, дэйктычных сродках (займенніках і прыслоўях з указальнай функцыяй), апушчэнні аднолькавых словаформ і інш. Напрыклад: *Быў адзін салдат з-пад Слуцка, а другі – з-пад Навагрудка* (М. Лужанін). *Голас у начальніка быў басавіты, і гэта збянтэжыла мужчын* (А. Пальчэўскі). *Старыя вербы каля хаты гудуць і гнуцца ва ўсе бокі, над долам сцелюць верх шырокі, і круціць бура ім галіны, кудлаціць, крышыць верхавіны* (Я. Колас).

Прэдыкатыўныя часткі складаназлучаных сказаў падзяляюцца на спалучальныя, супастаўляльныя, пералічальна-размеркавальныя і далучальныя.

Асноўнымі кваліфікатарамі семантыка-граматычных адносін, якія выражаюцца паміж часткамі складаназлучанага сказа, з’яўляюцца злучальныя злучнікі і злучальныя словы. Так, злучнікі *і, ды* (у значэнні *і)* злучальныя словы *потым, затым, пасля* аб’ядноўваюць прэдыкатыўныя часткі са спалучальнымі адносінамі; злучнікі *а, але, ды* (у значэнні *але*), *затое, аднак, толькі* – прэдыкатыўныя часткі з супастаўляльнымі адносінамі; злучнікі *і – і, ні – ні, то – то* і іншыя – прэдыкатыўныя часткі з пералічальна-размеркавальнымі адносінамі; злучнікі *і то, ды і, ды і то,* злучальныя словы *прычым, прытым* і іншыя – прэдыкатыўныя часткі з далучальнымі адносінамі. Злучнікі *і, а, але, ды ў* сілу адцягненасці свайго значэння могуць афармляць розныя віды адносін: *і* – спалучальныя, супрацiўныя, далучальныя; *а* – супастаўляльныя, спалучальныя, неадпаведнасці, далучальныя; *але* – неадпаведнасці, супраціўныя, далучальныя; *ды* – спалучальныя, супастаўляльныя, далучальныя. Для ўдакладнення значэння гэтых злучнікаў пры іх ужываюцца розныя сродкі (канкрэтызатары): трывальна-часавыя суадносіны дзеясловаў-выказнікаў, лексічнае значэнне аб’яднаных адзінак, асобныя словы і спалучэнні слоў.

РЕПАЗІТОРЫЙ БДПУ